

Фрагмент экспазіцыі аддзела народнага мастацтва на выстаўцы «Гармонія і асяроддзе». Мінск, 1986.

Традыцыі і сучаснасць

*Вольга Лабачэўская*

# Няпросты лёс простай саломкі

Калі сабраць усе публікацыі ў цэнтральнай і рэспубліканскай прэсе двух апошніх дзесяцігоддзяў пра сучаснае мастацтва беларускага саломапляцення і яго слынных майстроў, дадаць да гэтага артыкулы ў кнігах і энцыклапедыях — атрымаецца вялізны том. Назву для яго з таго мноства сакавітых і паэтычных эпітэтаў, на якія не скупіліся журналісты і мастацтвазнаўцы, выбраць будзе нялёгка: «Саламяны цуд», «Залатая казка», «Цуды з саломкі», «Сонечны цуд», «Саламяная казка»...

Хуткі ўзлёт адроджанага народнага рамяства, трыумфальнае шэсце беларускай саломкі па айчынных і замежных выстаўках і кірмашах, папулярнасць беларускіх саломапляцельшчыкаў сцвердзілі ў грамадскай свядомасці ўяўленне пра росквіт гэтага віду народнага мастацтва, гэтага мастацкага промыслу.

А ў беларускай саломцы з году ў год спеюць праблемы, яе слава ідзе на спад. І ўжо ёсць сур'ёзная перасцярога, што наступным пакаленням замест жывога, самабытнага мастацтва застануцца толькі музейныя экспанаты.

Перш чым акрэсліць кола праблем і магчымыя шляхі іх вырашэння, варта вызначыць характар сучаснага этапу развіцця саломапляцення, яго творчы патэнцыял, значэнне ў нацыянальнай культуры рэспублікі.

## Як пачыналася «саламяная казка»

Доўгі час рамяство і мастацтва пляцення з саломкі было звязана



выключна з сялянскай культурай. Яно ўяўляла сабою непасрэдны натуральны працяг асноўнага занятку земляроба — вырошчвання хлеба. Па сваёй сутнасці сялянскае саломапляценне — гэта складаны сінкрэтычны комплекс, звязаны з сялянскай працаю, абсталяваннем побыту, традыцыйнымі абрадамі, навакольным прыродным асяроддзем, калектыўным мастацка-рамесным вопытам і эстэтычнымі ўяўленнямі.

Народная эстэтыка саломкі, адухоўленая ідэяй урадлівасці, была чужая гарадской культуры. Таму



В. Гаўрылюк. Саламяная пластыка, 1960-ыя гг.

К. Арцёменка. Конь. Саломка, пляценне, 1970-ыя гг.

Т. Паўлоўская. Сувенірныя лялькі. Саломка, пляценне, 1986.



саломапляценне як від народнага мастацтва рэдка выходзіла за межы вёскі. На яго амаль не ўплывалі мастацкія густы гараджан, пануючыя стылі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Можа, таму саломапляценне і не сфарміравалася ў самастойны мастацкі промысел.

Беларусы, як і многія земляробчыя народы Еўропы, плялі з саломы капелюшы, абутак, гаспадарчыя ёмістасці, абрадавыя атрыбуты жніва — вянкі з калосся, чучалы з дажынкавых снапоў, «бараду» з апошніх каласкоў, выраблялі дэкаратыўныя падвясныя ўпрыгожанні — «павукоў» і птушак, якія таксама мелі непасрэдную сувязь з аграрнымі і рэлігійнымі ўяўленнямі. Акрамя таго ўбіраліся саломай на каляды, звязвалі саламяных ча-

лавечкаў і фігуркі жывёл для вясельных караваяў і дзіцячай гульні. Прыёмы пляцення з саломкі, распаўсюджаныя на Беларусі, а таксама формы вырабаў падобныя да тых, што сустракаюцца ў іншых рэгіёнах. Выключэнне — унікальныя, створаныя беларускімі майстрамі на мяжы XVIII і XIX стст. саламяныя брамы, што ўваходзілі ў ансамбль іканастаснага ўбрання праваслаўных храмаў. Гэтыя шэдэўры народнага саломапляцення, якія цяпер зберагаюцца ў музеях, не маюць аналагаў.

## «Хлеб-соль» з «Паўлінкі»

Прыкладна з сярэдзіны 60-ых гадоў традыцыйная сялянская саломка атрымала гарадскую «прапіску». Змяніўся характар гэтага віду народнага мастацтва, формы яго арганізацыі, сацыяльны статус. Яго развіццё пайшло па шляху асучаснівання духоўнай сутнасці і эстэтычнай функцыянальнасці, сцвярджэння свайго грамадскага значэння.

Большасць сучасных майстроў саломапляцення ўжо не вяскоўцы, гараджане, для якіх рамяство — прафесійная дзейнасць. Змянілася і сфера ўжывання вырабаў з саломкі — не вясковы побыт, а гарадскі інтэр'ер. Побач з індывідуальным спажыўцом-гараджанінам, які набывае прадукцыю ў якасці сувеніра, падарунка, з'явіўся дзяржаўны заказчык, які арганізуе промысел, заключае дагаворы, ладзіць мастацкія выстаўкі і тым самым скіроўвае дзейнасць майстроў.

Развіццё сучаснага саломапляцення ў першую чаргу звязана з прадпрыемствамі мастацкіх промыслаў. Сярод вырабаў з саломкі найперш вылучыліся нацыянальныя сувеніры, якія выяўляюць хараство, густ беларускага народа, каларыт нашай рэспублікі. Сацыяльны заказ на сувеніры быў рэалізаваны да пачатку 1970-ых гадоў. Вырабы з саломкі пачалі выпускаць Брэсцкая фабрыка сувеніраў, Магілёўская, Хойніцкая і Чачэрская фабрыкі мастацкіх вырабаў. У продажы з'явіліся саламяныя лялькі «Беларуска», «Хлеб-соль» і іншыя сувеніры. Многія з іх пачалі экспартавацца за мяжу. Творчасць пачынальнікаў промыслу В. Гаўрылюк і К. Арцёменка, папулярнасць новай сувенірнай прадукцыі далі магутны імпульс развіццю мастацтва саломапляцення.



Л. Главацкая. Певень. Саломка, пляценне, 1987.



А. Лось-Залужная. Павук. Саломка, пляценне, 1986.



Т. Агафоненка. Дэкаратыўная маска «Чорт». Саломка, пляценне, 1987.

Разам з тым масавая прадукцыя промыслаў, пастаўленая на прамысловы паток, паступова абязлічвалася і трацiла свае эстэтычныя якасці. Сёння амаль перапыніўся яе экспарт. Арганізаваныя мастацкія промыслы аддалі свой прыярытэт майстрам Мастацкага фонду Саюза мастакоў БССР, якія працуюць індывідуальна.

Эстэтычна выхаваны пакупнік, густ якога сфарміраваны выдатнымі выставачнымі ўзорамі, усё часцей мінае паліцы з трафарэтнай саламянай прадукцыяй у фірменным магазіне промыслаў «Паўлінка» і звяртаецца ў салон-магазін Мастацкага фонду. Саламяная скульптура Т. Агафоненка, Л. Лось, Л. Главацкай, Т. Паўлоўскай, дэкаратыўныя плеценыя куфэркі, зробленыя сямейнымі дуэтамі Саламянкаў, Грэсь, падвясныя канструкцыі — «павукі» А. Лось-Залужнай тут доўга не затрымліваюцца. Нягледзячы на немалы ў параўнанні з сувенірамі промыслаў кошт, гэтыя вырабы нязменна знаходзяць сваіх пакупнікоў.

Аднак не так ужо часта унікальныя або выкананыя ў некалькіх экземплярах творы з саломкі трапляюць у салон-магазін: майстры выконваюць экспартныя заказы, ствараюць падарункавыя вырабы для гасцей рэспублікі і беларускіх дэлегацый, што ад'язджаюць за мяжу. Яны загружаны заказамі і разнастайнымі афіцыйнымі прапановамі. Нават музеям нялёгка папоўніць свае зборы іх творамі..

Што ж трывожыць у гэтай эскізна накіданай карціне? На першы погляд, у ёй няма змрочных фарбаў. Прадпрыемствы промыслаў выпускаюць сувенірную прадукцыю. Актыўна працуюць слынныя майстры. Але колькі іх, гэтых майстроў?

## Майстар і школа

Саломапляцельшчыкаў у нас адзінкі. А народнае мастацтва, як вядома, жывіцца калектыўнасцю, масавасцю. Яно не можа развівацца як мастацтва таленавітых адзіночак. Для яго плённага развіцця патрэбны значны калектыў майстроў, якія валодаюць рамяством і, галоўнае, умеюць працаваць творча. Гэты закон не раз сумна пацвярджала жыццё, калі з апошнім майстрам памірала народная мастацкая традыцыя, створаная, захаваная многімі пакаленнямі.

Сапраўднага мастака, народнага майстра не задавальняе адсутнасць здаровай канкурэнцыі, тое, што ён не можа перадаць умельства вучням і ўбачыць у іх свой працяг. А многія нашы саломапляцельшчыкі — людзі пенсійнага ўзросту.



У 1986 годзе памерла Вера Ільінічна ГАЎРЫЛЮК—пачынальніца сучаснага беларускага саломапляцення, з імем якой мы дасюль звязваем ідэал народнага майстра—чалавека, які зберагае і развівае традыцыі.
У апошнія гады жыцця майстрыхі не раз падымалася пытанне пра арганізацыю ў яе доме музея, пра неабходнасць зберагчы не толькі ўсе работы, але і адметны інтэр'ер, хату, пад вокнамі якой раскаласілася жыта, дзе тварыўся добры і мудры свет...
Цяпер хату абжылі чужыя людзі. Пагаснічэ адзін ачаг народнага мастацтва.

Такім чынам, карэннае пытанне далейшага развіцця мастацтва беларускага саломапляцення—пытанне пераемнасці рамяства і зберажэння мастацкіх традыцый. На нашу думку, існуючыя формы навучання майстроў не могуць паўнацэнна рашыць гэтую задачу.

На прадпрыемствах промыслаў майстроў-выканаўцаў выхоўваюць больш вопытныя настаўнікі. Такая форма малаэфектыўная, бо адразу арыентуе на спрошчаныя прыёмы рамяства, якія склаліся на вытворчасці, не закладвае творчай асновы будучага майстра.

У сістэме Мастацкага фонду СМ БССР таксама за майстрамі замацоўваюць вучняў. Але, да прыкладу, сярод шматлікіх вучаніц Т. Агафоненка толькі адзін творчы майстар—Л. Главацкая. У пошуках прычын гэтага мы сутыкнёмся не толькі з праблемай перадачы навыкаў рамяства, але і духоўна-маральнага выхавання майстра саломапляцення.

Калі звярнуцца да біяграфій майстроў, няцяжка заўважыць, што ўсе яны гараджане ў першым, у сем'ях саломапляцельшчыкаў—другім пакаленні. А значыць, паходжаннем і выхаваннем звязаны з традыцыйнай народнай культурай, зберагаюць элементы фальклорнай свядомасці, у іх абвострана пачуццё еднасці з прыродай. Многія з іх валодаюць сялянскімі рамёствамі па праву пераемнасці. Менавіта гэтае асяроддзе так званых новых гараджан вылучыла таленавітых майстроў беларускай саломкі. Сапраўдны майстар можа нарадзіцца толькі праз любоў да матэрыялу і ўсведамленне яго асацыятыўнай сувязі са спрадвечнымі каштоўнасцямі і традыцыямі культуры народа. Без перабольшання можна сказаць, што высокі мастацкі вынік у мастацтве саломапляцення дасягальны толькі тады, калі матэрыял для майстра робіцца духоўнай субстанцыяй, успрымаецца ім як сувязное звяно ў ланцужку чалавек—прырода—праца.

Такім чынам, выхаванне новых пакаленняў майстроў павінна ўключаць не толькі авалоданне тэхнікай рамяства, але і аднаўленне страчанай чалавекам сучаснага горада сувязі з навакольным асяроддзем, што можа зрабіцца адной з альтэрнатыў разбурэнню экалагічнай свядомасці, інтэграцыйным і тэхнакратычным працэсам, якія нарастаюць у культуры.

Мастацтва саломапляцення як творчая дзейнасць, як аб'ект эстэтычнага ўспрымання будзе садзейнічаць умацаванню ў сучаснай культуры такіх каштоўнасцей, як павага да прыроды, працы земляроба, да гістарычнага і культурнага мінулага народа. Важнае са-



Кацярына Гаўрылаўна АРЦЁМЕНКА (1925 г. н.) таксама стаіць ля вытокаў сучаснага беларускага саломапляцення. Многія яе творы маюць грамадзянскае, патрыятычнае гучанне. Шырока вядомы кампазіцыі Кацярыны Арцёменка на гісторыка-рэвалюцыйныя тэмы. Яна смела звяртаецца да сучасных вобразаў. Найбольш удалая, як нам здаецца, дынамічная і выразная фігура саламянага каня, названага «Конь-агонь».
Творчасць майстрыхі непасрэдна звязана з Магілёўскай фабрыкай мастацкіх вырабаў—адзіным прадпрыемствам у нашай краіне, дзе выпрабляюць саламяныя сувенірныя лялькі. Агульнае мастацкае вырашэнне, стылістыка магілёўскіх сувеніраў знойдзены Кацярынай Арцёменка і адшліфаваны ў працэсе калектыўнай творчасці ўсіх майстроў промыслу. За заслугі ў развіцці мастацтва саломапляцення і мастацкага промыслу Кацярыне Арцёменка нададзена ганаровае званне «Заслужаны работнік культуры БССР».

цыяльна-культурнае значэнне мае і яшчэ адзін бок гэтай праблемы — вярнуць узбагачанае новымі мастацкімі традыцыямі мастацтва саломапляцення ў сучасную вёску, дзе сёння амаль няма творчых майстроў — актыўных удзельнікаў выставак, адсутнічаюць якія-небудзь арганізаваныя формы навучання рамяству.

Самая эфектыўная форма выхавання майстра — сямейная пераемнасць. Тры пакаленні займаюцца саломкай у дынастыі Веры Ільінічны Гаўрылюк — Таіса Паўлаўна Агафоненка і Тамара Анатольеўна Паўлоўская. Саломапляценнем займаюцца маці і дачка — Ларыса Мікалаеўна Лось і Алена Уладзіміраўна Лось-Залужная, а таксама іншыя члены гэтай сям'і. У творчай садружнасці працуюць Яўген Паўлавіч і Галіна Уладзіміраўна Саламянкі, Аляксандр Яфімавіч і Галіна Сцяпанаўна Грэсі. Сямейныя гарадскія дынастыі саломапляцельшчыкаў — гэта своеасаблівы феномен сучаснага народнага мастацтва. Аднак гэтая з'ява не можа стаць залогам далейшага развіцця мастацтва саломапляцення. Патрэбна наладжаная сістэма навучання гэтаму віду рамяства і мастацтва. Ёсць усе ўмовы для стварэння школы саломапляцення ў Мінску. Прафесійная падрыхтоўка мастакоў па пляценню з саломкі можа быць арганізавана на базе мастацкага вучылішча імя А. Глебава. Настаўнікамі будучых майстроў могуць стаць Т. Агафоненка, Л. Лось, Л. Главацкая, Т. Паўлоўская.

Падрыхтоўку майстроў для прадпрыемстваў мастацкіх промыслаў варта арганізаваць у Бабруйскім і Гомельскім спецыяльных прафесійна-тэхнічных вучылішчах. За вопытам можна звярнуцца да суседняй Украіны, дзе наладжана сістэма падрыхтоўкі майстроў па ўсіх відах нацыянальных мастацкіх рамёстваў: вышыўцы, ткацтву, разьбе па дрэву.

Стварыўшы сваю сістэму падрыхтоўкі прафесійных кадраў, рэспубліка праз некалькі гадоў здолее забяспечыць выкладчыкамі дзіцячыя мастацкія школы, міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты, кіраўнікамі — гурткі і студыі па саломапляценню. Усё гэта, несумненна, паспрыяе масаваму далучэнню да гэтага віду мастацкай творчасці дзяцей і дарослых, якім сёння фактычна няма дзе атрымаць навыкі работы з матэрыялам. А цікавасць да пляцення з саломкі з кожным годам узрастае. У гэтым мы не раз пераконваліся на святах народных рамёстваў, калі майстры дэманстравалі сваё мастацтва.

У тэрміновым здзяйсненні праграмы па стварэнню нацыянальнай мастацкай школы саломапля-



Таіса Паўлаўна АГАФОНЕНКА (1927 г.н.) — адна з найбольш цікавых сучасных саломапляцельшчыц. Яе работы на выстаўках успрымаюцца як уверцюры да экспазіцыі. Аднак асоба майстрыхі засталася ў цені. Пра яе мала пісалі, не ацанілі належна і яе наватарскую ролю ў развіцці мастацтва беларускай саломкі.
Таіса Агафоненка — прафесійны мастак, скончыла Мінскае мастацкае вучылішча. Два апошнія дзесяцігоддзі працуе выключна з саломкай, чым абавязана сваёй маці — Веры Ільінічне Гаўрылюк. У творчасці Таісы Агафоненка надзіва арганічна з'ядналіся фальклорнасць мыслення і прафесійны мастацкі падыход да формы і дэкаратыўнага вырашэння. У стварэнні дэкаратыўнай скульптуры ёй належыць адкрыццё новага канструктыўнага прыёму — увядзенне чарнавога каркаса, што карэнным чынам змяніла традыцыйны прынцып пластычнай работы з саломкай, у выніку пачалі інтэнсіўна развівацца спосабы дэкаратыўнай апрацоўкі матэрыялу.
Пластычныя і дэкаратыўныя знаходкі мастачкі — не самамэта, а вынік яе вобразна-мастацкага бачання. У творах Таісы Агафоненка ёсць дзіцячая вера ў казку і цуд. Яна ачалавечвае, персаніфікуе вобразы «братоў нашых меншых» — жывёл і птушак. Ёй уласцівы назіральнасць, мяккі гумар. Часам выяўляецца нават гарэзлівасць, уласцівая людзям з дзіцячай непасрэднасцю ўспрымання і майстрам, што дасканала валодаюць сваім майстэрствам.
Таіса Агафоненка — член Саюза мастакоў БССР з 1985 года.



Лідзія Рыгораўна ГЛАВАЦКАЯ (1936 г. н.) — таленавітая майстрыха, мастацтва якой развіваецца на аснове вобразна-пластычнай сістэмы Таісы Агафоненка. Дзякуючы сваёй настаўніцы Лідзія Главацкая засвоіла складаную пластычную мову дэкаратыўнай анімалістычнай скульптуры з саломкі. Але, несумненна, жывяць вобразны лад яе мастацтва і ўспаміны дзяцінства, якое прайшло ў в. Падгрушша Смалявіцкага раёна.
З саломкай Лідзія Главацкая пачала працаваць у 1975 годзе. Яна здолела знайсці сваю адметную інтэрпрэтацыю вобразаў птушак і конікаў. Добра вядома яе скульптура «Алень — Залатыя рогі», якая прадстаўляла народнае мастацтва Беларусі на шматлікіх айчынных і замежных выстаўках.
Лідзія Главацкая мае тонкае прыроднае пачуццё матэрыялу, умее ювелірна яго апрацоўваць. Саломка ў яе руках амаль траціць адчувальную матэрыяльнасць, здаецца, свеціцца знутры, ствараючы чароўную гармонію вобраза і матэрыялу. Разам з Таісай Агафоненка Лідзія Главацкая была ў 1985 годзе прынята ў Саюз мастакоў БССР. Варта адзначыць, што гэта першыя народныя майстры ў рэспубліцы, прынятыя ў творчы саюз.

цення бачыцца залог таго, што ў будучым у рэспубліцы з'явяцца новыя таленавітыя мастакі і майстры, якім працягваць традыцыі беларускай саломкі.

## «Залатыя карункі» на патоку

Асаблівай увагі вымагае стан саломапляцення ў арганізаваных мастацкіх промыслах. Сёння страчаны многія мастацкія традыцыі саламянай пластыкі на Брэсцкай фабрыцы сувеніраў і Магілёўскай фабрыцы мастацкіх вырабаў. Асартымент, які трапляе ў магазіны, зусім вузкі. Майстры пераводзяцца на работу з пальмавай пляцёнкай, закупленай у В'етнаме.

Калі ў далейшым прадпрыемствы промыслаў будуць вырабляць з саломкі толькі спрошчаныя сувеніры, не турбуючыся пра стварэнне паўнацэнных у вобразных і мастацкіх адносінах твораў, пра творчы рост майстроў і будучай змены, мы страцім жывую аснову для далейшага развіцця гэтага віду народнага мастацтва.

Промыслы неабходны для натуральнага функцыяніравання народнага мастацтва. Аднак паточную вытворчасць з арыентацыяй на колькасць і вал (дзе ўсё роўна — выпускаць вырабы з беларускай саломкі ці в'етнамскай пляцёнкі) варта замяняць іншымі формамі: кааператывамі, сямейнымі кааператыўнымі майстэрнямі, больш гнуткімі ў арганізацыі творчага працэсу і матэрыяльнага стымулявання. Клопат пра развіццё кааператыўнай формы арганізацыі промыслу саломапляцення разам з Упраўленнем мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР можа ўзяць на сябе Беларускі фонд культуры.

Пры прадуманай арганізацыі промыслу, павышэнні крытэрыяў ацэнкі якасці вырабы з саломкі складуць значную частку экспарту рэспублікі, зробяцца сапраўды залатымі. А цікавасць да беларускай саломкі за мяжою вялікая. Саламяныя куфэркі, скульптура, дэкаратыўныя кветкі, біжутэрыя маюць шанц быць папулярным экспартным таварам, як і руская матрошка.

Мы бачылі, які велізарны поспех мела мастацтва нашых майстроў, калі яны працавалі на гандлёвых кірмашах у Італіі і Францыі, на XII Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве, у дні Беларусі на ВДНГ СССР напярэдадні 70-годдзя Кастрычніка. Паказальная ў гэтых адносінах прапанова турыстычных фірм ЗША арганізаваць праз «Інтурыст» туры ў Беларусь з тым, каб навучыць амерыканцаў народным рамёствам, у першую чаргу — саломапляценню.



Па дасканаласці валодання матэрыялам у жанры дэкаратыўнай пластыкі побач з Т. Агафоненка і Л. Главацкай можна паставіць таксама Тамару Анатольеўну ПАЎЛОЎСКУЮ (1952 г. н.). Аднак вызначыць яе творчы статус паводле звыклых крытэрыяў цяжка. Яна патомная саломапляцельшчыца (дачка Таісы Агафоненка і ўнучка Веры Гаўрылюк), працягвае сямейную традыцыю. Але назваць яе народным майстрам наўрад ці правільна. Тамара Паўлоўская скончыла Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут і працуе з саломкаю як прафесійны прыкладнік. Сёння яна, мусіць, адзіная бачыць у саломцы сродак для ўвасаблення сучасных вобразна-пластычных ідэй і спрабуе рэалізаваць іх у новых формах. Шукае ў мастацтве саломапляцення аднадумцаў, шчодра дзеліцца ідэямі.
Пакуль што становішча маладой мастачкі няпростае, быццам паміж народным і прафесійным мастацтвам. На справе гэта стварае праблемы ўдзелу ў выстаўках, уступлення ў члены Саюза мастакоў, здзяйснення ідэй на «аб'ектах».



Традыцыі народнага пляцення з саломкі прадметаў утылітарнага прызначэння працягваюць у сваёй творчасці муж і жонка САЛАМЯНКІ, што жывуць у Баранавічах.
Яўген Паўлавіч Саламянка родам з сям'і патомных майстроў, пра што красамоўна сведчыць і ягонае прозвішча. Але прыроджаны дар раскрыўся толькі ў 1977 годзе, калі Яўген Паўлавіч разам з жонкай Галінай Уладзіміраўнай перайшоў працаваць з Баранавіцкай фабрыкі мастацкіх вырабаў у Мастацкі фонд Саюза мастакоў БССР.
У Саламянкаў моцная традыцыйная аснова прадметнай форматворчасці. Хараство і дасканаласць створаных імі з саломкі кошыкаў, латкоў, сумак настолькі ўражваюць, што ва ўспрыманні гледача утылітарная функцыя гэтых прадметаў як бы адступае на другі план. Гэтая якасць ператварае іх работы ў сапраўдныя творы мастацтва. Мастацкая дасканаласць работ Саламянкаў — вынік высокага прафесійнага майстэрства, даведзенага да віртуознасці і ювелірнай дакладнасці. Культура тэхнікі пляцення і культура матэрыялу ўзведзены імі ў ранг эстэтычных якасцей.

# Мастацтва XXI стагоддзя



Пётр Аляксандравіч ГАТОЎКА (1922 г. н.)—вясковы саломапляцельшчык, імя якога стала вядома некалькі гадоў назад. Жыве ў в. Урэчча Вілейскага раёна. Рамяство, якім у часы яго дзяцінства валодалі ўсе вяскоўцы, Пётр Гатоўка згадаў, калі выйшаў на пенсію. У ім прачнулася мастакоўская натура. Вялікае значэнне для яго мела маральная падтрымка і прафесійныя парады яго суседзяў—сям'і мастака Цітовіча, які пераехаў сюды на жыхарства з Мінска.
Пётр Гатоўка пляце куфэркі, пано, сшывае з плеценых стужак скульптурныя выявы коней і конікаў, аленяў. Пастаянна ўдзельнічае ў выстаўках і штораз здзіўляе гледачоў і спецыялістаў самабытнасцю твораў.



Як майстар пляцення саламяных капелюшоў вядомы Франц Міхайлавіч СЯРПЕЙКА з в. Цюпішкі Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці. З пляцёнкі «елачка» і «зубатка» ён сшывае ладныя капелюшы, фасоністыя картузы і фуражкі. Яны, як і раней, вельмі патрэбныя вяскоўцам, сталі абавязковымі атрыбутамі касцюмаў фальклорных ансамбляў. Іх купляюць у якасці арыгінальных беларускіх сувеніраў. Аднак рамяство ў вёсках знікае. Не зрабілася яшчэ нормай паважнае, піетэтнае стаўленне да патомнага вясковага рамесніка як да Майстра. Толькі калі традыцыйныя рамёствы стануць у вачах вяскоўцаў прэстыжным заняткам, у старых майстроў з'явяцца пераемнікі. І не толькі ў Франца Міхайлавіча Сярпейкі. Але і ў Васіля Піліпавіча Мееркі з в. Галоўчыцы Драгічынскага раёна, Івана Астапавіча Алексеюка з в. Оса Кобрынскага раёна, Пятра Казіміравіча Карэніка з в. Слабодка Браслаўскага раёна, Івана Станіслававіча Краўчонка з в. Суднікі Браслаўскага раёна.

У саломапляценне як віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — багаты мастацкі патэнцыял. Яго рамкі значна шырэй, чым толькі сувеніры і выставачныя творы. Знаходкі сучасных майстроў сведчаць пра шырокія магчымасці для стварэння разнастайнай статуарнай пластыкі, дэкаратыўных прадметаў утылітарнага прызначэння. Несумненна, ёсць будучыня ў саломкі і як дэкаратыўнага матэрыялу для аздаблення грамадскіх інтэр'ераў. Прасторавыя падвясныя мобілі ў традыцыях народных «павукоў», аб'ёмна-прасторавыя кампазіцыі, дэкаратыўныя букеты саламяных кветак... Колькі хараства, цеплыні, нацыянальнага каларыту надалі б яны нашым кафэ, кінатэатрам і іншым месцам адпачынку!

Зроблены першыя крокі ў такім перспектыўным кірунку развіцця саломапляцення, як стварэнне сцэнічных атрыбутаў для фальклорных і тэатральных калектываў. Народны майстар Л. Главацкая, мастакі С. Хруцкая і Т. Сурмачэўская зрабілі для брэсцкага ансамбля «Радасць» дэкаратыўных саламяных птушак і маскі.



Т. Агафоненка. Конь «Залацісты». Саломка, пляценне, 1984.

У незвычайнай якасці (як ювелірны матэрыял) была выкарыстана саломка ў прыгожых галаўных уборах, паясах і ўпрыгожаннях, створаных Т. Паўлоўскай для дэманстрацыі калекцыі сучаснага адзення рэспубліканскага Дома мадэляў у Італіі і трыкатажу навукова-даследчай мастацка-эксперыментальнай лабараторыі прадпрыемстваў промыслаў — на Усесаюзным сімпозіуме моды ў Таліне.

Думаецца, творы з саломкі зоймуць сваё пачэснае месца і на выстаўках прафесійнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Згадаем, якім высокім прафесіяналізмам, выразнай нацыянальнай афарбоўкай вылучаецца мастацтва апрацоўкі скуры ў творчасці прыкладнікоў Эстоніі і Латвіі.

Мастакі Т. Паўлоўская і А. Лось-Залужная, выходзячы з народных традыцый, спрабуюць вырашаць у саломцы зусім новыя вобразныя і фармальныя задачы. Пазначанае ў апошні час «вучонае» адгалінаванне ад народнага саломапляцення вымагае ўвагі і падтрымкі секцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Саюза мастакоў БССР, карэкцыі работы камісіі па народных майстрах. Нельга не заўважыць таго факта, што з саломкай пачынаюць працаваць выпускнікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, вабіць гэты матэрыял і архітэктараў. Было б мэтазгодна дапамагчы такім мастакам (частка іх групуецца вакол

Т. Паўлоўскай) арганізаваць выстаўку, калі можна так сказаць, «нетрадыцыйнага» саломапляцення. На гэтым шляху нас, несумненна, чакаюць цікавыя адкрыцці. Цяпер агульнавядома, які плён дало асваенне традыцый народнага ткацтва эстонскімі і латышскімі майстрамі габелена, як па-сучаснаму выкарысталі традыцыі народнай дрэваапрацоўкі фінскія дызайнеры.

## Давайце пачнём з музея...

З нацыянальным самабытным відам народнага мастацтва, пра які ідзе гаворка, сёння глядач можа пазнаёміцца толькі ў філіяле Дзяржаўнага мастацкага музея БССР у Раўбічах. Там экспануюцца знакамітыя саламяныя брамы і работы сучасных майстроў. Наведваюць гэты музей інтурысты, групы Бюро падарожжаў і экскурсій, заходзяць паміж трэніроўкамі і спаборніцтвамі і спартсмены. Але не сакрэт, што мінчане і «неарганізаваныя» госці сталіцы — рэдкія наведвальнікі ў Раўбіцкім дзяржаўным музеі беларускага народнага мастацтва.

Наспела неабходнасць стварыць Музей беларускай саломкі ў Мінску! Ён мог бы зрабіцца цэнтрам па прапагандзе гэтага віду народнага мастацтва і эстэтычнага выхавання дзяцей. У комплексе з экспазіцыяй твораў сучасных майстроў патрэбна студыя, дзе жадаючыя змогуць атрымаць урокі рамяства, дзе пастаянна будуць арганізоўвацца выстаўкі і конкурсы. Калі ж яшчэ размясціць музей у цэнтральнай частцы Мінска — Верхнім горадзе або Траецкім прадмесці, ён, несумненна, зробіцца адным з самых цікавых турыстычных аб'ектаў сталіцы, будзе не менш папулярны, чым унікальны музей бурштыну ў Калінінградзе і музей чарцей у Каўнасе. Думаецца, з ініцыятывай стварэння музея беларускай саломкі можа выступіць Беларускі фонд культуры.

Сёння мы не можам спадзявацца на стыхійнае развіццё народнага мастацтва. Для яго падтрымкі патрэбны прадуманыя арганізацыйныя меры. Важную ролю ў гэтым можа адыграць распрацоўка і паслядоўнае здзяйсненне рэспубліканскіх комплексных праграм па далейшаму развіццю традыцыйных відаў народнага мастацтва. У першую чаргу вымагае ўвагі самабытная і унікальная наша беларуская саломка.

Фота М. Раманюка, В. Сасноўскага, Я. Сахуты і з архіва аўтара.

**«Беларусьфільм»-87**

*Ніна Фральцова*

# Як віцязь на раздарожжы

Прызнаюся: пісала гэты артыкул пра беларускі дакументальны кінематограф няпроста. Нямала крытычных стрэл зламалася за апошнія два гады аб прадукцыю студыі «Летапіс». Былі публікацыі ў рэспубліканскай прэсе. З рэзкімі заўвагамі ў адрас нашых дакументалістаў выступіла Т. Цюрына ў газеце «Советская культура». І на старонках «Мастацтва Беларусі» неаднойчы з'яўляліся палемічныя нататкі, у якіх выказваліся цікавыя думкі пра далейшае развіццё беларускай дакументалістыкі.

Што яшчэ можна дадаць да таго, што ўжо сказана? Думаю, нямала прадуктыўных ідэй можна знайсці на шляху не толькі крытычнага, але і аналітычнага, комплекснага асэнсавання месца і ролі дакументальнага кіно рэспублікі ў сучасным кінапрацэсе. Баюся, што ў апошнія гады менавіта на гэтым напрамку ў кінематаграфістаў не ставала сіл, каб зразумець, у якім пункце экраннай прасторы знаходзіцца дакументальны фільм і куды з гэтага пункту ён павінен рухацца.

Не дапамагла разабрацца ў гэтым пытанні і наша крытыка. Грунтуючыся на ацэнцы бягучай кінапрадукцыі, мы часцей за ўсё зыходзілі з суб'ектыўнага крытэрыю ў падыходзе да канкрэтнага твора. З поля зроку выпадала агульная карціна стану грамадскай думкі і грамадскай свядомасці.

Не прыватныяназіранні за дакументальным працэсам, а ўдумлівае даследаванне прычын, што абумовілі яго адставанне, — вось што сёння, думаецца мне, неабходна для таго, каб зрабіць больш важкім удзел кінакрытыкі ў выпрацоўцы адзінай стратэгічнай лініі на дакументальным экране.

У гэтым святле хацелася б паглядзець на тыя 12 дакументальных стужак, што былі прадстаўлены на XVI аглядзе-конкурсе прадукцыі «Беларусьфільма». Можна, вядома, абрынуцца на арганізатараў агляду за тое, што ў яго праграме былі паказаны не ўсе фільмы, створаныя ў 1987 годзе. Але думаецца, што з агульнай колькасці работ адабраны якраз тыя, па якіх можна даволі дакладна меркаваць, чым жыве сёння беларуская дакументалістыка. Меркаваць пра тыя супярэчнасці, якія сёння з'яўляюцца вырашальнымі: паміж новым разуменнем задач дакументалістыкі ў